ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 37 (1004) | ПЯТНІЦА, 14-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК

Два рашаючых тыдні

НА ФРОНЦЕ ЛЕСАЗАГАТОВАК НЯ ЗРОБЛЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ

Мобілізаваныя Койданаўскім РК ЛКСМБ 40 комсамольцаў ганебна ўцяклі з лесу

Нядбайнасьць мясцовых арганізацый—зрывае вывазку лесу

Пад суд кулакоў, якія ўхіляюцца ад гужавой павіннасьці

Прайшло ўжо больш 14 дзён, як па БССР пачаўся месячнік па загатоўках лесу і вывазу яго.

Вынікі першых пяці дзён амаль па ўсіх лесараёнах сьведчаць аб тым, што грамадзкая думка вакол месячніку ня была разгорнута, што на сёнешні дзень кулацкія гаспадаркі ня прыцягнуты ў абавязковым парадку да вывазу лесаматар'ялаў і дроў, што коопэрацыя на мясцох не забясьпечвае лесарубаў і возчыкаў лесу патрэбнымі прадуктамі і прамтаварамі.

Даныя па Мазырскай акрузе кажуць аб тым, што стан лесазагатовак знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Так, Птыцкі вучастак за першыя пяць дзён лютага вывез загатоўленага лесаматар'ялу—3,9% і дроў—5,4%, Пасталоўскі вучастак вывез лесаматар'ялу толькі 1,2%, дроў—4,1%.

На самым першым месцы ідзе толькі Калінкавіцкі раён, які вывез 25,9% загатоўленых дроў і 3,3% лесаматар'ялу.

КОЛГАСЫ Ў БАКУ АД ЛЕСАЗАГАТОВАК

Шмат якія колгасы адмаўляюцца прыняць удзел у вывазцы лесу. Так, Мазырскі Акрколгассаюз, Калінкавіцкі, Нараўлянскі і Жыткавіцкі райвыканкомы зусім бязьдзейнічаюць. Савгас Камаровічы і вёска Замосьце Лепельскага раёну адмовіліся ад заключэньня умовы па вывазцы лесу. Па Пасталоўскаму вучастку (гэты вучастак вядзе работу і на тэрыторыі Бабруйскай акругі), сельсаветы Старобінскага, Любаньскага і Чырвона-Слабодзкага раёнаў не садзейнічаюць вывазцы лесу. Пакаваныя РВК да гэтага часу не далі належных дырэктыў сельсаветам.

Па Полацкаму лесраёну заўважаецца вельмі маруднае здавальненьне паасобных лесвучасткаў гужавой сілай і слабы ўдзел колгасаў. Праўда, за пэрыод першых дзён лютага павялічылася колькасьць падвод, але гэта не ўтварае значнага пералому і не дае поўнай упэўненасьці ў тым, што разгортваньне вывазкі будзе пасьпяховым.

Па Гомельскаму лесараёну, ня гледзячы на тое, што акруговы камітэт партыі і Акрвыканком далі канкрэтныя заданьні кожнаму раёну аб абавязковым уцягненьні ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія маюць цягавую сілу і асабліва колгасаў, да вывазкі лесаматар'ялаў, трэба адзначыць, што РВК аднесьліся да гэтай справы фармальна і канкрэтнага нічога не зрабілі.

Замест патрэбных па Гомельскаму лесраёну 35 тысяч падвод на 1-е лютага працавала толькі 6471 падвода. У колгасах Хойніцкага раёну з 4000 коняй, на вывазцы працуюць толькі 200

Асабліва дрэнныя і нядбайныя адносіны праявілі да справы лесанарыхтовак наступныя райвыканкомы: Лоеўскі, які замест 2000 падвод даў 110, Камарынскі замест 1000—даў 60, Брагінскі з вызначаных 2600 падвод ня даў ніводнай, Церахоўскі замест 2500—даў 400 і Ўгаравіцкі замест 3000—даў 250 падвод. Астатнія райвыканкомы выканалі заданьне толькі на 15—20%.

Зразумела, што такое становішча адбілася на колькасьці вывезенага лесу. На 1 лютага вывезена лесаматар'ялаў 21,6 проц. гадавога заданьня, у тым ліку па экспорту —16,4 проц. і апалу—16,19 проц.

Трэба адзначыць, што райкомы КП(б)Б амаль нічога не зрабілі для таго, каб райвыканкомы выканалі дырэктывы аб месячніку лесанарыхтовак.

ПРЫМУСІЦЬ КУЛАКОЎ ВЫВЕЗЬЦІ ЛЕС

Асабліва нікуды ня вартай зьяўляецца работа, а праўдзівей кажучы—бязьдзейнасьць амаль усіх райвыканкомаў і сельсаветаў па прыцягненьню кулацкіх гаспадарак да абавязковага вывазу лесаматар'ялаў.

З маючыхся па Мазырскай акрузе 1200 кулацкіх гаспадарак да гужпавіннасьці прыцягнуты толькі 135.

Па Полацкай акрузе павінны быць прыцягнуты у абавязковым парадку 1000 кулацкіх гаспадарак, а на справе гэтага няма. На Юхавіцкі і Клясьціцкі лесвучасткі сельсаветы павінны былі накіраваць 700 кулацкіх падвод, а на 5 лютага працавалі толькі 30 падвод. На мясцох сустракаюцца вылазкі кулацтва, якое дамагаецца сарваць вываз лесу. Так, па Полацкаму раёну распаўсюджваюцца чуткі аб тым, што 40 проц. заработку сялян будзе ўзята для колгасаў, альбо агітацыя такога зьместу: „Лесбелу вывозіць трэба, а значыць, дадуць столькі, колькі запросім“.

Па папярэдніх падліках па Гомельскай акрузе кулацкія гаспадаркі павінны былі даць на лесазарыхтоўкі больш 5000 падвод, але ў сапраўднасьці на 5 лютага працавала толькі 344 падводы.

Асобныя райвыканкомы нядбайна аднесьліся да справы прыцягненьня кулакоў да гужпавіннасьці. Да гэтага часу ў некаторых раёнах ня ўручаны кулацкім гаспадаркам абвесткі, а там, дзе гэткія ўручаны, нічога ня зроблена для таго, каб прымусіць кулакоў выканаць заданьні. Напрыклад, у Брагінскім раёне з вызначаных 600 кулацкіх падвод не працуе ніводная. У Хойніцкім ад 500 кулацкіх гаспадарак працуе толькі 25 падвод. У Гомельскім з 660 працуе 25, у Камарынскім з 200 працуе 5.

Кулацкія гаспадаркі, якія ўхіляюцца ад гужпавіннасьці, некаторымі райвыканкомамі ня прыцягваюцца да адказнасьці.

Гэткае зьявішча выцякае з існуючай у асобных раёнах думкі, што кулак ужо зломлены. Апрача таго маюцца і прымірэнцкія адносіны з боку паасобных работнікаў сельсаветаў і райвыканкомаў да асобных кулакоў.

Усё гэта падкрэсьлівае неабходнасьць ужыць больш цьвёрдыя і рашучыя захады, каб прымусіць кулацкія гаспадаркі вывезьці вызначаныя для іх нормы. Трэба прыцягнуць да адказнасьці кулацкія гаспадаркі, якія ўхіляюцца ад вывазкі лесаматар'ялаў. Ніякіх прымірэнцкіх адносін, а таксама думак аб тым, што кулак ужо зломлены, не павінна быць. Прымірэнцы, так як і кулакі, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці. Застаўшыяся два тыдні павінны зрабіць рашучы пералом у справе вывазкі загатоўленага лесаматар'ялу.

Яўхім Сталёвы.

Комсамол Койданаўшчыны ня вытрымаў клясавай позіцыі

(Ад нашага спэцкора)

Стан загатовак лесаматар'ялу і дрэва па Койданаўскаму вучастку лесараспрацовак 3-га раёну МББ чыгункі дрэнны. На сёнешні дзень загатоўлена лесаматар'ялаў і дрэва 84 проц. гадавога заданьня.

Яшчэ горш абстаіць справа з вывазам загатоўленага лесу. На 8-е лютага вывезена каля 18 проц. гадавога заданьня па лесаматэр'ялах і 6 **проц.** па дрэву.

З патрэбных штодзённа 1010 падвод для вывазу лесу, на 8-е лютага працавала ў дзень 285 **падвод.**

Кулацкія гаспадаркі на сёнешні дзень яшчэ ня прыцягнуты да абавязковай гужавой павіннасьці. З 360 кулацкіх гаспадарак і вялікай колькасьці пазбаўленцаў Койданаўскага раёну, на 10 лютага працавала па вывазу **толькі 30 падвод** ад кулацкіх гаспадарак.

Сельсаветы ў правядзеньні месячніку пакуль што не аказалі, амаль ніякай дапамогі. **Старшыня Путчынскага** сельсавету нават адмовіўся выехаць з работнікамі жалезкому ў вёску для правядзеньня сходаў сялян па пытаньню аб вывазе лесу.

Паказаньні аб месячніку і аб прыцягненьні кулацкіх гаспадарак да вывазу лесаматар'ялаў і дрэва былі дадзены райвыканкомам **толькі 31-га** студзеня. Шмат якія сельсаветы атрымалі гэтыя паказаньні праз 4—5 дзён. Вядома, што такія „сьпешныя“ паказаньні РВК не ўзварушылі сельсаветаў, якія прывыклі чакаць цыркулярных паказаньняў з боку РВК.

Што датычыцца ўдзелу комсамольскай арганізацыі Койданаўшчыны ў лесазагатоўках, дык трэба **адкрыта і па-бальшавіцку сказаць, што комсамол Койданаўскага раёну ня вытрымаў позыцый на гаспадарчым фронце.** З мобілізаваных па лініі РК ЛКСМБ **40 комсамольцаў зьявілася ў лес толькі 10 чалавек,** якія, прапрацаваўшы адзін дзень, на другі ня прышлі.

Такія адносіны з боку комсамольцаў да лесазагатовак нікуды ня варты. **РК ЛКСМБ павінен прыняць рашучыя меры да тых, хто ня вытрымаў клясавых позіцый.**

Х. БАЦЬВІНІК.

ЮНКОРЫ!

Рэдакцыя газэты „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“ просіць усіх сваіх корэспондэнтаў, якім былі дасланы вучотныя анкеты, як мага хутчэй запоўніць іх і зьвярнуць у рэдакцыю.

Да ведама ўсіх дэлегатаў Усебеларускага Зьлёту „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ“

Зьлёт адкрываецца 15-га лютага г. г.,

а 6-й гадзіне ўвечары,

у памяшканьні Клюбу Савгандльслужачых (рог Комуністычнай і Энгельса).

Атрыманьне мандатаў і рэгістрацыя будзе вытварацца ў ЦК ЛКСМБ 15-га лютага з 8 г. раніцы.

Дэлегаты зьлёту сустракаюцца на вакзале членамі штабу

Уваход на зьлёт па мандатах і запрашальных білетах.

Члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК БССР члены ЦСПСБ, члены АК КП(б)Б і АК ЛКСМБ праходзяць па сваіх мандатах.

НАЧАЛЬНІК ШТАБУ РЫНДЗІЧ.

Барацьба польскага пролетарыяту разрастаецца

Лёкаут у Бельскім раёне ахапіў 20 фабрык

Віленскія беспрацоўныя падрыхтоўваюцца да арганізацыі „галоднага паходу“

ВАРШАВА, 12. Лёкаут у Бельскім раёне пашыраецца. Лёкаут ахапіў 20 фабрык, на якіх было занята 20 тыс. рабочых.

Насьпявае сур'ёзны канфлікт

ВАРШАВА, 12. У сталяліцейнай прамысловасьці Верхняй Сілезіі насьпявае сур'ёзны конфлікт паміж прадпрыемцамі і рабочымі. Прамыслоўцы маюць намер прыступіць к паступоваму скарачэньню рабочых да 5 проц. у месяц.


19 тысяч беспрацоўных у Варшаве

ВАРШАВА, 12. Колькасьць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у Варшаве дасягнула 19 тысяч. Беспрацоўе расьце ва ўсіх галінах прамысловасьці.

Беспрацоўныя рыхтуюцца

ВАРШАВА, 12. Сярод віленскіх беспрацоўных вядзецца падрыхтоўка да арганізацыі галоднага паходу. Паліцыя прымае ўсемагчымыя захады да зрыву дэмонстрацыі.

Як яны разбройваюцца



На здымку: Дрэдноуты амэрыканскага флёту, якія манэўруюць у Атлянтычным акіяне

150 тысяч беспрацоўных у Баўгарыі

ВЕНА, 12. Лік беспрацоўных у Баўгарыі дасягнуў 150 тысяч чалавек. Усе яны знаходзяцца ў надзвычайна цяжкім становішчы, бо не атрымоўваюць ніякіх дапамог.

Хубейская провінцыя ахоплена паўстаньнямі

ШАНХАЙ, 12. Па паведамленьнях агэнцтва Рэйтэр, у шэрагу паветаў Хубейскай провінцыі ўзмацніўся паўстанцкі рух, якім кіруюць комуністыя. У паведамленьні агэнцтва гаворыцца, што паветы ахоплены паўстаньнем. Хубейская вайсковая ўлада патрабуе адпраўкі з Нанкіну спэцыяльнай карацельнай экспэдыцыі для барацьбы з паўстанцамі.

Паўмільёна беспрацоўных у Аўстрыі

Компартыя арганізуе паход беспрацоўных на Вену

ВЕНА, 12. Беспрацоўе у Аўстрыі рэзка абвастраецца. Агульная колькасьць беспрацоўных дасягае паўмільёну. У адной толькі Вене каля 100 тысяч беспрацоўных. У сакавіку компартыя арганізуе паход беспрацоўных на Вену пад лёзунгам „хлеба і работы“. У шэрагу гарадоў адбыліся дэмонстрацыі беспрацоўных.

Барыкадныя баі ў Гішпаніі

Танкі і кулямёты супроць рабочых

БЭРЛІН, 7-1. Газэта „Ротэ Фанэ“ паведамляе з Мадрыду, што становішча ў Гішпаніі робіцца ўсё больш і больш напружаным. Па ўсёй краіне ня спыняюцца масавыя дэмонстрацыі і сходы. У Мадрыдзе зноў адбыліся сур'ёзныя сутычкі паміж паліцыяй і дэманстраваўшымі рабочымі і студэнтамі. У Барсэлоне паліцыя і войска абкружылі танкамі і кулямётамі рабочыя раёны. У ноч на 1-е лютага аднавіліся барыкадныя баі. Узброеным рабочым нечаканай вылазкай удалося прарваць вайсковую цэп і прымусіць войскі адступіць. Баі працягваюцца.

Да 12-ай гадавіны Чырвонай арміі

Усё па-баявому, па-ўдарнаму

Гадавіна Чырвонай арміі,—гадавіна яе перамог, яна павінна даць новыя тысячы ўдарнікаў, якія, памятаючы аб перамогах Чырвонай арміі, будуць ва ўдарным парадку рыхтаваць сябе да новых перамог.

З арт. тав. АРОНШТАМА.

Захоўваючы слаўныя традыцыі грамадзянскай вайны, непераможная Чырвоная армія змагаецца за сацыялістычную перабудову нашай гаспадаркі

Новы 10-тысячны атрад ударнікаў

Да 12-й гадавіны Чырвонай арміі трэба ўліць у яе шэрагі новы 10-тысячны атрад ударнікаў. (З адозвы РВС акругі да ўсіх партыйных і комсамольскіх організацый, усіх камандзіраў, політработнікаў і чырвонаармейцаў).

Атрымаўшы гэта баявое заданьне, партыйнае бюро Самарскага палка вынесла ўжо баявы загад—**ня менш 200 новых ударнікаў да 12-й гадавіны РСЧА.**

Кулямётчыкі ўжо практычна намецілі свае кантрольныя лічбы,—**ня менш 25 новых ударнікаў, ударных кулямётаў да 12 гадавіны РСЧА.** Зараз па ўдарнаму ўзяліся за выкананьне гэтай баявой задачы.

Склікалі сход комсамольцаў. Дакладчык вастанаўліваецца на дырэктыве ЦК ЛКСМБ аб ударніцтве. Сход вырашае абвясьціць ударнікамі ўсю комсамольскую організацыю палка.

Таксама завострана пытаньне над надыходзячай масавай самаправеркай ударніцтва і соцспаборніцтва ў Чырвонай арміі.

Быў склікаты чырвонаармейскі сход, на якім улілося 32 новых ударніка па страявой службе і політвучобе. Быў абвешчаны цэлы кулямёт ударным.

Новымі, сьвежымі сіламі ўдарнікаў-байцоў і начскладу будзем яшчэ больш па-ўдарнаму ўзьнімаць баявую магутнасьць РСЧА.

ШЫФРЫН.

Увесь полк—ударным

№-скі полк будзе праводзіць 12 гадавіну Чырвонай арміі разам са сваімі шэфамі. Будуць склікаты ротныя і батальённыя сходы сумесна з шэфскімі організацыямі. — Гэтае сьвята пройдзе ў нас пад лёзунгам праверкі соцспаборніцтва і работы ўдарных груп.

Увесь полк рыхтуецца да абвяшчэньня сябе поўнасьцю ударным па баявой падрыхтоўцы чырвонаармейцаў, політасьветрабоце, і наогул па пытаньнях соцыялістычнага будаўніцтва, як па вёсцы, так і ў горадзе.

У гэты дзень усе комсамольскія і грамадзкія організацыі павінны праверыць работу ТСА-Авіяхімаўскіх ячэек, вайсковых куткоў, якія маюцца пры бібліотэках, чытальнях і г. д. У гэты дзень павінен быць выкананы лёзунг. «Усе ў шэрагі ТСА-Авіяхіму»!

Протчанка Зах.



Курсанты АБВШ рамантуюць сялянскія плугі

Удзельнічаем у соцыялістычнай перабудове вёскі

Прыезд 4-га эскадрону ў вёску Загор'е быў спатканы з вялікім уздымам. На пляцы разьвіваўся чырвоны сьцяг, пад гукі беларускай марсэльёзы сяляне ішлі насустрач прыехаўшым чырвонаармейцам. Тут-жа на плошчы адбыўся невялікі мітынг.

Пасьля мітынгу групай КСМ сумесна з комсамольцамі вёскі быў праведзены сход. На гэтым сходзе комсамольцы высунулі шэраг практычных прапаноў, як лепш ачысьціць насеньне, сабраць насенфонды, абагуліць сельска-гаспадарчы інвэнтар і жывёлу, сабраць непатрэбныя ў гасп дарчы рэчы і за іх кошт утварыць фонд машынізацыі колгасаў. Паміж комсамольцамі эскадрону і комсамольцамі вёскі заключаны дагавор па соцспаборніцтву. Усе комсамольцы захоплены энтузыязмам, ачышчаюць насеньне, рамантуюць сельгасінвэнтар, праводзяць гутаркі, робяць кармушкі для абагуленай жывёлы.

У колгасе „Комінтэрн“ групай КСМ з 14 чалавек 4-га эскадрону абмалочана 20 коп (копа 60 снапоў) жыта і 4 копы пшаніцы, уся салома складзена ў скірты.

Зроблены мост праз роў торфбалота. Наладжана масавая папраўка абутку, падкавана 25 коняй і адрамантавана 25 плугоў, два з іх адрамантаваны капітальна.

З. Кубрынскі.

Па Савецкай Беларусі

ПА ТЭЛЕГРАФУ І ТЭЛЕФОНУ АД НАШЫХ КОРЭСПАНДЭНТАЎ

Шмат абсьледваньняў—мала карысьці

Шмат было абсьледваньняў, шмат гаварылі аб 9-ым вучастку цягі на ст. Гомель-пасажырская; прыходзілі камісіі, нешта гаварылі, запісвалі і на гэтым канчалася. З рабочымі ніхто з прадстаўнікоў камісіі не дагадаўся пагутарыць. Лаўчная камісія, якая разьмяркоўвала талёны на дэфіцытныя тавары, у першую чаргу абслугоўвала сябе. Старшыня крамкамісіі СТРАБУЛАЕЎ захапіў сабе амаль што ўсе талёны: на шэрсьць, пшанічную муку, на абутак; ён байцца за сваю жонку, каб яна не стаяла ў чарзе побач „з простымі“ людзьмі.

Страбулаеў грубы з пайшчыкамі. Нейкую грамадзянку, якая ў магазыне дакранулася да сялядца, ён з крыкам выштурхнуў на двор.

У дом адпачынку пасылалі тых, якія працуюць на вытворчасьці 5-6 месяцаў, і адмаўлялі тым, якія на вытворчасьці некалькі гадоў. Нам. начальніка вучастку тав. САЛАВЕЙ зьняў з працы брыгадзіра кацельшчыкаў тав. МОСЕНКА за тое, што той адмаўляў сваю віну ў затрыманьні цягніка і вінаваціў галоўныя майстэрні, якія ня прыслалі дымагарных труб. За гэта САЛАВЕЙ накінуўся на яго з крыкам: „ДЫК ШТО-Ж, ПА ТВОЙМУ ГЭТА—ПА ВІНЕ АДМІНІСТРАЦЫІ, ЦІ ШТО?“ І калі Мосенка яшчэ раз пацьвердзіў сказанае, Салавей паклікаў табельшчыка і загадаў аддаць Мосенку марку, зьняўшы яго такім чынам з працы, калі Мосенка зьвярнуўся ў мясцком, яму адказалі: „Ды што там, начальнік накрычаў, а праз некаторы час і забудзецца, ідзі і працуй“. Так ён зрабіў. Салавей убачыўшы яго ізноў на рабоце, ускіпеў: „КАЛІ ТЫ НЯ ПОЙДЗЕШ САМ ДАМОЎ, ДЫК Я ЦЯБЕ СІЛАЙ ВЫВЯДУ“. Так і зрабілі, тав. Мосенка паслалі на „Сахалін“ (гэта месца працы штрафных рабочых).

КЛІМАЎ, брыгадзір мядзянага аддзяленьня крыў адміністрацыю за тое, што апошняя давала дрэнны вугаль з прычыны чаго выходзілі дрэнныя работы, — таксама папаў у лік штрафных рабочых.

Ударная брыгада моладзі на бягучым рамонце РАСПАЛАСЯ і толькі таму, што адміністрацыя забрала хлапцоў працаваць у другія месцы. Комсамольскі колектыў не зварочваў на гэта ўвагі.

Былы стапнік вагонаў тав. ЗАЙЦАЎ за „неуважение к начальству“—санітарнаму ўрачу Мігаю прабыў бяз працы 5 месяцаў.

Маляра ГОФЭЛЯ ганялі па ўсім вучастку за тое, што Гофэль унёс прапанову афарбаваць бронезапас пакуль цёпла, бо як настануць марозы, цягнікі абледзянеюць і ўвясну фарба можа зьлезьці. Партыец ГРАХОЎСКІ заявіў Гофэлю:—„Калі-б не задзіраўся з адміністрацыяй дык і да гэтага-б часу сядзеў-бы ў канторы“. Былы старшыня мясцкому Лебедзеў не даваў рабочым магчымасьці крытыкаваць яго працу. Пасьля выступленьня рабочага з крытыкай адміністрацыі, Лебедзеў узяў слова, абляў выступаючага і гэтым самым спыніў выступленьні астатніх рабочых. Гэта толькі частка фактаў, іх можна было-б прывесьці куды болей. Трэба было-б каму сьлед падумаць аб парадках на 9-ым вучастку.

ГАРНЯК.

Крок уперад, пяць—назад

Сьвіслацкі мясцком саюзу працаўнікоў асьветы зусім ня турбуецца аб працы па вясновай пасеўнай кампаніі. Дырэктыў аб практычнай працы на мясцох няма. Акруговае праўленьне дае добры кірунак у гэтай галіне працы, але ён ня выконваецца.

Навылучалі розных камісій, штабаў і ўдарных брыгад для складаньня плянаў, але імі нічога ня зроблена. Мясцкому час падумаць, каб не давялося плянамі сеяць сьвіслацкае поле.

СЬВІСЛАЦКІ.

НІЧОГА НЯ ЗРОБЛЕНА

Па Жылвініцкаму сельсавету (Бабруйшчына) праца па падрыхтоўцы да веснавой пасеўкампаніі амаль не распачата. Вёскі ня ведаюць аб пляне правядзеньня пасеўкампаніі па сельсавеце, ды і наогул, як відаць, пляны ня выпрацаваны. **Ачыстка насеньня** зусім не распачата. Комсамольская ячэйка і іншыя грамадзкія організацыі таксама нічога ня робяць у гэтай галіне. Трэба сельсавету неадкладна ўзяцца за падрыхтоўку вясновай пасеўнай кампаніі, мобілізуючы вакол гэтага пытаньня вясковы актыў і ўсю грамадзкасьць.

Юнкор.

Па-новаму

У Чачэрскім раёне, Гомельскай акругі організавалася агромная сельска-гаспадарчая комуна імя Леніна. Гэтай комунай ахоплена некалькі сельсаветаў і пасёлкаў поўнасьцю. Комуна мае свой цагельны завод. З вясны гэтага году распачынаюць будаваць крухмальны завод, які будзе перапрацоўваць 250 тысяч пудоў бульбы. З вясны гэтага году пачнецца засадка саду, пад які адводзіцца 500 га зямлі.

С. СЯРДЗЮКОЎ.

Бяз панікі і перагібаў

Політыка ліквідацыі кулацтва, як клясы нарадзілася ў выніку практыкі суцэльнай колектывізацыі. Суцэльная колектывізацыя ёсьць ліквідацыя ўсякага гаспадараньня, заснаванага на прыватнай уласнасьці на сродкі вытворчасьці.

Кулацтва, якое будуе свой дабрабыт на далейшым росьце і разьвіцьці сваёй капіталістычнай гаспадаркі і на разьвіцьці капіталістычных адносін у краіне, ня можа ня выступаць люта супроць колектывізацыі. Процэс суцэльнай колектывізацыі ёсьць такім чынам, процэс клясавай барацьбы, у якую ўцягваюцца шырачэзныя масы батракоў, беднякоў і серадпякоў, якія колектывізуюцца, і ў якой гэтыя масы супроцьстаяць кулацтву, як клясе.

Гэтага характару суцэльнай колектывізацыі і неабходнасьці актыўнага ўдзелу мас у ліквідацыі кулацтва, як клясы — некаторыя таварышы не разумеюць.

Суцэльная колектывізацыя і раскулачваньне ўяўляюцца імі лёгкай справай. І на самай справе, куды прасьцей ліквідаваць кулацкія гаспадаркі адміністрацыйным парадкам і такім-жа адміністрацыйным парадкам колектывізаваць сялянскую масу?

НІЯКІХ ПЕРАГІБАЎ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА

Ў тых выпадках, калі раскулачваньне хочуць замяніць голым адміністраваньнем, не мобілізуючы вакол яго масы, ці бо калі колектывізацыю праводзяць такімі-ж адміністрацыйнымі мерамі, — мы маем справу з самымі шкоднымі перагібамі. Як не захоўвайся тут рэволюцыйнымі сказамі, вынік атрымоўваецца далёка не рэволюцыйны, бо ў такіх выпадках узмацняецца позіцыя кулака.

Перагібы гэтыя няўхільны зьвязаны з п о ў н а й няўважлівасьцю да дырэктывы партыі аб організацыі і ўзмацненьні ў вёсцы батрацка бядняцкіх груп, якія больш усяго дапамагаюць пераходу колектывізацыі на рэйкі масавага руху, уцягваючы ў яго серадняцтва, батрацка-бядняцкія групы, падводзяць пад адміністрацыйныя меры ў адносінах кулацтва моцны і шырокі грамадзкі падмурак. Бяз іх лёгка могуць быць ужыты паблажкі ў адносінах да кулака, і самараскулачваньне ня дасьць таго эфэкту, які неабходзен. Хто масавы рух падмяняе адміністраваньнем, вялома, не адчувае патрэбы ў батрацка-бядняцкіх організацыях, і падчас такая практыка даводзіць да таго, што і батракі з беднякамі застаюцца ў баку ад колектывізацыі.

Неабходнасьць барацьбы з адміністрацыйнымі перагібамі зусім не азначае, што можна замарудзіць ход колектывізацыі і раскулачваньня. Не, ні на хвіліну. Усе сілы павінны быць мобілізаваны, каб з найбольшай хуткасьцю, апіраючыся на батрацка-бядняцкія групы, у цесным саюзе з серадняком, разгортваць колектывізацыю і ўдарыць па кулацтву.

Уся наша політыка павінна выходзіць з неабходнасьці ліквідацыі кулацтва, як клясы

ТРЭБА ВЕСЬЦІ ЗМАГАНЬНЕ НАВАТ І З САМЫМІ ДРОБНЫМІ СПРОБАМІ ЗАТАРМАЗІЦЬ ПРОЦЭС СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І РАСКУЛАЧВАНЬНЯ Ў РАЁНАХ СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Неабходна самым рашучым парадкам сачыць за тым, каб барацьба супроць перагібаў ня была скарыстана, як сродак барацьбы СУПРОЦЬ САМОЙ ПОЛІТЫКІ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Доўгія вушы правага опортунізму і згодніцтва досыць адкрыта выглядаюць з-пад шматлікіх панічных заяў аб адміністрацыйных перагібах. Панікёры ве..юць, куды б'юць: ім важна затармазіць колектывізацыю і раскулачваньне. Яны хацелі-б даць кулаку перадышку яшчэ на некаторы час. У гэтым клясавы сэнс усёй іх панікі!

Імкненьне опортуністычных элемэнтаў прадоўжыць перадышку для кулака выяўляецца і ў тым, як некаторыя мысьляць нашы адносіны да кулака ў раёнах, дзе яшчэ не праводзіцца суцэльная колектывізацыя. „Політыка ліквідацыі кулака, як клясы,—гавораць яны, —пашыраецца толькі на раёны суцэльнай колектывізацыі, да астатніх-жа раёнаў яе прыстасоўваць нельга“. Такім чынам пад п о л і т ы к у ліквідацыі кулацтва, як клясы, падподзіцца адно толькі раскулачваньне. Гэта няправільна. Раскулачваньне, якое ўжываецца ў раёнах суцэльнай колектывізацыі, ёсьць заключны акт у політыцы ліквідацыі кулацтва, як клясы. Але і там, дзе яшчэ раскулачваньне ня ўжываецца, УСЯ НАША ПОЛІТЫКА ПАВІННА ВЫХОДЗІЦЬ З НЕАБХОДНАСЬЦІ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ. І дзеля таго, што раскулачваньне ёсьць неадлучная частка суцэльнай колектывізацыі, то паскораная колектывізацыя ў раёнах, дзе яна яшчэ не прыняла агульнага характару, павінна быць ГАЛОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ ПОЛІТЫКІ ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ. Але гэтага мала: выключна ўся праца павінна быць перабудавана так каб яна давала вынікі для колектывізацыі і падрыхтоўвала-б ГЛЕБУ ДЛЯ РАСКУЛАЧВАНЬНЯ па меры ўсё большага і большага ахопу насельніцтва колгасным рухам. Адначасова ня толькі ніякіх паблажак кулаку, але наадварот, узмацненьне наступленьня супроць яго аж да ўжываньня да яго (кулака) фактычнага раскулачваньня ў тых выпадках, калі ён зьнішчае сваю жывёлу ці займаецца шкодніцтвам колгаснаму будаўніцтву.

РАСКУЛАЧВАНЬНЕ І МАСАВАЯ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ — НЕПАДЗЕЛЬНЫ

Раскулачваньне і масавая колектывізацыя непадзельна зьвязаны адно з другім—гэтага ня трэба забывацца. Раскулачваньне толькі адзін бок політыкі ліквідацыі кулацтва. Грунтоўным жа застаецца масавая колектывізацыя, якая праводзіцца ва ўмовах узмацненьня батрацка-бядняцкага ядра ў колгасах і ва ўсіх вясковых організацыях, узмацненьне мясцовых саветаў і жорсткае прымяненьне законаў, якія-б дазвалялі РАЗГОРТВАЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЕ супроць кулакоў, якія жывуць па-за межамі раёнаў суцэльнай колектывізацыі.

Політыка раскулачваньня і суцэльнай колектывізацыі — справа ня лёгкая. Лістападаўскі пленум ЦК партыі знашоў неабходным спэцыяльна папярэдзіць партыю ад недаацэнкі цяжкасьцяй колектывізацыі. Гэтыя цяжкасьці патрабуюць ад нас максымальнай вытрымкі і здольнасьці падняць масы. Бяз мас нам не перамагчы цяжкасьцяй, бо бяз мас ня было-б і самой рэволюцыі.

Ні перагібаў, ні панікі не павінна быць у нашай працы. Кожны партыец і кожны комсамолец павінен з поўным разуменьнем, з усёй энэргіяй праводзіць лінію партыі ў працы па колектывізацыі і раскулачваньню!

Ал. ГОРЫН.

Да ўсебеларускага політбою

ПОЛІТВУЧОБУ—НА ПОЎНЫ ХОД!

Месцы сыгналізуюць: *зрываюцца заняткі, паслаблена увага РК ЛКСМБ і ячэек да паходу за рэволюцыйнай тэорыяй*

Разгорнем спаборніцтва на лепшую пастаноўку політвыхаваньня, ліквідуем тэорэтычную адсталасьць унутры комсамолу

У дапамогу комсамольскай ячэйцы

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ПОЛІТБОЮ

Адным з мерапрыемстваў па правядзеньню 3-х месячніка беларускай і нацменаўскай пролет. культуры зьяўляецца ўсебеларускі політбой па нац. пытаньню і 5-х годцы.

Політбой ставіць сваёй мэтай праз спаборніцтва падкаваць кожнага камсамольца Ленінскай тэорыяй у нац. пытаньні, глыбока разабраць сутнасьць і карэньні вылазак клясавага ворага (нац. дэмократызм. шовінізм і інш.) падвесьці вынікі ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве, бо пераможцам будзе лічыцца тая ячэйка, раён, акруга, дзе добра падрыхтуюцца тэорэтычна. а таксама выступяць у бойку з абаронай сваёй організацыі лепшымі паказчыкамі ўдзелу комсамолу ў правядзеньні лініі партыі, дзе будуць лепшыя паказчыкі ўдзелу комсамолу ў колектывізацыі, выкананьні промфінпляну, дзе больш выставяць ударных брыгад, комун, цэхаў і інш. сродкаў абароны—збор падпіскі на трактарную калёну, творы Леніна, падводную лодку і інш. Усё гэта будзе сьведчыць аб баяздольнасьці организацыі, як з тэорэтычнага боку, так і з боку практычнага.

УЗБРОІМСЯ ТЭОРЫЯЙ

Зараз-жа неабходна паставіць больш выразна ўсю сыстэму політвучобы, ахапіўшы поўнасьцю задатнымі політгурткамі рабочую, батрацка-бядняцкую, колгасную моладзь, а таксама і дарослых. Пры тэорэтычнай падрыхтоўцы неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на растлумачэньне контр рэволюцыйнай сутнасьці апошніх вылазак нац. дэмократаў, праяўленьня шовінізму ўсіх колераў, скажэньня клясавай лініі НКЗ, НКА і інш.. а таксама неабходна да політбою прапрацаваць апошнія рашэньні партыі і комсамолу (пленум ЦК КП(б)Б, ЦК УсеЛКСМ, ЦК ЛКСМБ).

Раённыя політбаі трэба скончыць не пазьней 25 га красавіка 1930 г. з тым, каб да 1-га мая можна было ўлічыць перамогшую акругу і вызначыць прэмію, а лепшых політбайцоў мяркуецца ў маі месяцы паслаць на экскурсію на Ўкраіну. АК і РК неабходна забясьпечыць кіраўнікамі і літаратурай, а таксама паклапаціцца аб прэміяваньні лепшых раёнаў, ячэек бібліотэчкамі, радыё і інш. Політбаі трэба праводзіць на бел. мове.

ЯК ПРАВОДЗІЦЬ РАЁННЫЯ ПОЛІТБАІ

Кожны раён выступае супроць другога раёну. Калі-ж па тэрыторыяльных умовах гэта немагчыма, тады раён падзяляецца на дзьве часткі і праводзіць політбой паміж сваімі ячэйкамі сфармаваўшы іх у два палкі па статуту РСЧА з прыцягненьнем як беспартыйнай моладзі, так і дарослых.

Рота аднаго палка выступае супроць роты другога палка з належнымі задаткамі, як узводы ўдарнікаў, прыхільнікаў варштату, а таксама з паўнымі лічбамі і дыяграмамі ўдзелу комсамольскай організацыі ў гаспадарчым будаўніцтве.

Для спатканьня двух рот, неабходна адшукаць памяшканьне сямігодкі, клюбу, нардому, ці што інш. і разьмеркаваць політбайцоў у пакоях так, каб у адным пакоі знаходзіліся два разьдзелы. Разьдзелы займаюць пазыцыі ў пакоі так, каб сядзець адны супроць другіх з камандзірам разьдзелу, а пасярэдку павінен сядзець міжнароднік.

Пакой для шпіталю і губы неабходна адшукаць асобна ў гэтым самым будынку.

Камандзір аднаго ўзводу выклікае па сьпісу сваіх байцоў, якія задаюць пытаньне (выстрал па свайму супраціўніку). З праціўнага боку камандзір ўзводу выклікае па сьпісу байца для адказу. За адказаныя пытаньні ставіць плюс з прыколкай жэтону, за неадказаныя пытаньні альбо няправільны адказ міжнароднік ставіць байцу мінус, адправіўшы яго ў шпіталь для высьвятленьня. (Накіроўваюць у шпіталь санітары). У шпіталі дактары (консультанты) растлумачваюць незразумелае пытаньне, прышпіліўшы жэтон параненага. Калі здарыцца, што на заданае пытаньне працаўнік не адказаў выклікаюць другога, калі другі не адказаў, выклікаюць трэцяга. калі і трэці не адказаў, тады павінен растлумачыць гэта пытаньне той. хто зрабіў выстрал. Калі-ж стрэліўшы задаў пытаньне няправільна, альбо сам ня ведае адказу, яго адпраўляюць на губу. За няпоўны адказ не бходна накіроўваць у шпіталь дзеля дадатковага высьвятленьня.

Байца, які не адказаў на тры запытаньні, неабходна накіраваць на губу. дзе ён застаецца да канца політбою і атрымае тлумачэньне на ўсе незразумелыя яму пытаньні. За спазьненьне, недысцыплінаванасьць у часе політбою байцоў таксама неабходна адпраўляць на губу. дзе з імі займаюцца асобна.

Адзін бок вядзе наступленьне на працягу паўтары гадзіны, потым наступае ў тым-жа парадку другі бок.

Ударнікі, прыхільнікі варштату і іншыя выступаюць разам з усёй організацыяй. Сакратар ячэйкі паведамляе аб сілах з тым, каб яны маглі весьці бойку ня толькі па тэорэтычных пытаньнях, але і па практычнаму ўдзелу організацыі ў гаспадарчым будаўніцтве, абмену вопытам працы і інш.

Перамогшай лічыцца тая організацыя, дзе будзе меншы процант пабітых і параненых і дзе будуць пададзены лепшыя сродкі абароны, як ударныя брыгады, комуны, колгасы, збор на трактарную калёну, творы Леніна і інш.

Да політбою кожны баец павінен падрыхтаваць ня менш пяці тэорэтычных запытаньняў.

Міжнароднікаў, дактароў неабходна мобілізаваць праз РК КП(б)Б.

У кожным раёне складаецца, штаб політбою, які вядзе падрыхтоўку і ў момант самога бою АК ЛКСМБ павінен вызначыць свайго прадстаўнік дзеля вырашэньня конфліктных спраў.

АБАВЯЗКІ РАЁННЫХ ШТАБАЎ

Раённы штаб складаецца з 5 асоб з прадстаўніком РК КП(б)Б.

Штаб павінен весьці падрыхтоўку да політбою, праз дапамогу організацыі політгурткоў, політшкол, пастаноўкі дакладаў і інш.

Неабходна паклапаціцца аб забясьпечаньні літаратурай дакладчыкамі, кіраўнікамі, падборам кадраў міжнароднікаў. дактароў і інш.

Разьбіць організацыю па падразьдзяленьням прытрымліваючыся ячэйкавага прынцыпу (яч. не падзяляць, а выстаўляць адну супроць другой з папярэднім выклікам).

Забясьпечыць памяшканьнямі.

Даслаць матар'ял аб ходзе падрыхтоўкі ў АК ЛКСМБ і скласьці канчатковую опэрацыйную зводку, паказаўшы тэорэтычную падрыхтаванасьць, а таксама ўсе сілы выстаўленыя ў абарону свайго раёну: ударныя брыгады, комуны. правядзеньне трохмесячніку і ўдзел усёй організацыі ў гаспадарча-культурным будаўніцтве.

Акруговым штабам неабходна падагуліць усю праробленую працу па правядзеньню політбаёў па раёнах і даслаць у ЦК ЛКСМБ не пазьней 25-IV дакладныя весткі аб тэорэтычнай падрыхтаванасьці і ўсе сілы па ўдзелу комсамольскай організацыі свайй акругі ў гаспадарча-культурным будаўніцтве.

АПА ЦК ЛКСМБ.

ГОРА АД „КІРАЎНІЦТВА"

Па Фрунзэўскаму райкому КСМ (Менск) падрыхтоўчая праца да політвучобы праводзілася амаль кожнай ячэйкаю сумесна з партыйнымі ячэйкамі. Комсамольцы некаторых вытворчых ячэек зараз ахоплены політвучобаю на 60-70 проц і беспартыйная рабочая моладзь на 50 проц. У некаторых ячэйках комсамольцы ахоплены ўсяго на 20 проц. Напрыклад, у ячэйцы заводаў „Беларусь" і „Пролетары" з 25 комсамольцаў політвучобай ахоплена толькі 5 чалавек.


Трэба адзначыць, што заўважваецца адсеў ад політвучобы. Напрыклад, у ячэйцы працколектыву абутнікаў у пачатку навучальнага году займалася 30 комсамольцаў, а зараз ходзіць на заняткі толькі 16 чалавек.

Комсамольцы з цукернай фабрыкі „Праўвет" рабілі шмат пропускаў без уважлівых прычын. Нельга не адзначыць выпадкаў, калі верхавіна (сакратар ці члены бюро) лічаць сябе досыць політычна падрыхтаванымі і не зьяўляюцца на заняткі, напрыклад, сакратары комсамольскіх ячэек заводаў „Беларусь" і „Пролетары" не займаюцца політвучобай, лічачы сябе політычна «адукаванымі».

Нельга абыйсьці моўчкі і таго, што большасьць ячэек не вядзе сталага вучоту комсамольцаў ахопленых політвучобаю. На заводзе „Беларусь" і „Пролетары" ў выніку такой безадказнасьці маецца 80 пр. комсамольцаў не ахопленых політвучобай.

Амаль усе апоргі ячэек скардзяцца на райком і АПА РК, што апошнія не даюць ніякіх паказаньняў у працы. Апорга Фрунзэўскага РК цяжка знайсьці, каб параіцца з ім.

„Лёгкі кавалерыст"



„Рыхтуецца" да політбою

Усе па-трохі... нічога ня робяць

У Турынскай ячэйцы КСМ політвучоба праходзіць слаба. У ячэйцы няма сталых заняткаў. Сакратар ячэйкі тав. **Лапко** *сам заняткі не наведвае і не клапоціцца аб тым, каб наладзіць працу політгуртка.*

Сярод комсамольцаў ёсьць шмат політычна-няпісьменных.

Кіраўнік гуртка таксама ня прымае ніякіх мер да таго, каб палепшыць становішча політгуртка. Ён замест працы ў гуртку кожны дзень вандруе па полі са стрэльбай, а вечарам сымулюе.

Цікава, з якім багажом уступіць комсамольская ячэйка ва ўсебеларускі політбой.

Верас.

Юнкоры пішуць

— Па Заслаўскаму раёну політвучоба праходзіць дрэнна.

Комсамольскія ячэйкі не разгарнулі як сьлед політвыхаваньня. Райкому комсамолу трэба больш зацікавіцца справаю палітадукацыі з тым, каб комсамольскую організацыю падрыхтаваць да надыходзячага ўсебеларускага політбою

М. П.

— У Пасецкай вясковай ячэйцы з палітвучобай катастрафічнае становішча Ячэйка яшчэ не распачынала працу па палітвыхаваньню. Сярод комсамольцаў большасьць політычна-няпісьменных.

Што робіць райком—невядома. Цікава, з чым прыдзе ячэйка да політбою?

ХІТРЫ САЎКА.

Пабудуем падводную лодку імя Комсамолу

Кожная ячэйка—

БАЯВЫ ШТАБ ПА ЗБОРУ СРОДКАЎ НА ПАДВОДНУЮ

Кастрычнікаўскі і Фрунзэўскі РК чакаюць дырэктыў...

Справа пабудовы падводнай лодкі імя Комсамолу мае вялікае політычнае значэньне, і сьнежаньскі пленум ЦК УсеЛКСМ падкрэсьліў ва...насьць гэтага мерапрыемства.

Выкананьне гэтай пастановы—баявая задача дня.

Належныя сродкі трэба сабраць ня ў два гады, а на працягу аднаго году.

Паглядзім-жа як гэтая пастанова выконваецца комсамольскімі камітэтамі і асобнымі організацыямі.

Бюро Кэстрычні‹аўскага і Фрунзэўскага РК комсамолу на сваім паседжаньні пытаньня аб зборы сродкаў не разглядалі. І як кажуць сакратары райкомаў: **«мы яшчэ не атрымалі ніякага распараджэньня з Мэнскага акруговому комсамолу».**

Тым часам, у раёнах не вядзецца ніякай работы па збору сродкаў за выключэньнем некаторых комсамольскіх ячэек, якія ўзяліся за гэтую справу, але кіраўніцтва райкомаў не паклапацілася своечасова падхапіць іх пачын і добры прыклад перанесьці ў другія ячэйкі.

Менскі АК ЛКСМБ таксама ў сваю чаргу ня прыдаў вялікага значэньня справе збору сродкаў, і ніякага паказаньня райкомы не атрымалі.

Такое становішча зусім недапушчальнае.

Патрэбна зараз-жа усёй арганізацыі разгарнуць збор сродкаў на падводную лодку.

Уносім і выклікаем

Мы, комсамольцы фабрыкі „Адраджэньне" (Менск) уносім у фонд пабудовы падводнай лодкі па 3 рублі кожны і выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу комсамольцаў нашай фабрыкі: Стэрліна, Бодчіча, Зімкелева, Свавод зіна, Міцільмана, Зіліна, Язьміна, Варона, Доўнара і Скормана.

Багдановіч
Шыдлоўскі.

Пачалі збор сродкаў

Бюро Мазырскага АК ЛКСМБ, разглядзеўшы на сваім паседжаньні пытаньне аб зборы сродкаў на падводную лодку, дало цэлы шэраг практычных прапаноў нізавым організацыям у правядзеньні ў жыцьцё пастановы пленуму ЦК УсеЛКСМ.

Тут-жа на паседжаньні сабралі 23 рублі і выклікалі на соцспаборніцтва сатаварыскую Карасьценскую комсамольскую організацыю (Украіна), бюро АК КП(б)Б, прэзыдыум АВК і акрпрофбюро.

Рыўкін Я. Л.

Да політбою ня рыхтуюцца

У Нова-Беліцы комсамольская політшкола вельмі дрэнна працуе.

Спачатку навучальнага году запісалася 35 чал., а цяпер наведвае толькі 16. Усяго ў арганізацыі 500 чалав к комсамольцаў.

На фабрыцы „Вэзуві" і на лесазаводзе „Колтру" ёсьць таксама многа беспартыйнай рабочай моладзі, якая не ахоплена вучобай.

Райком толькі і ведае, што рэгулярна плаціць кіраўнікам грошы, але ні разу не задумаўся над тым, колькі комсамольцаў і моладзі ахоплена політвучобай і як праходзяць гэтыя заняткі.

Райкому КСМ Нова-Беліцы патрэбна больш сур'ёзна аднесьціся да пастаноўкі політвучобы, каб праводзімы ў хуткім часе ўсебеларускі політбой не застаў організацыю зьнянацку.

МІХАСЬ ІТКІН.

РАЎНЯЙЦЕСЯ ПА ХЛЕБАЗАВОДУ

Комсамольская ячэйка Магілеўскага хлебазаводу ў выкананьне пастановы пленуму ЦК УсеЛКСМ аб пабудове падводнай лодкі імя комсамолу рашыла быць застрэльшчыкам у гэтай справе.

Сход комсамольскай ячэйкі ўхваліў сабраць сродкі на добраахвотных пачатках. Тут-жа сабрана 45 руб. 50 кап.

Выклікаем усебеларускую організацыю КСМ і ў першую чаргу харчавікоў пасьледаваць нашаму прыкладу.

Парэцкі.

БІБЛІОГРАФІЯ

За правільную політычную орыентацыю комсамольскіх ячэек

Кніжка ў шэрагу пытаньняў не адбівае задач, што стаяць перад комсамольскімі ячэйкамі

(Міх. Лабадаеў. „Бальшавіцкім тэмпам". БДз.В 1930 г.)

Белдзяржвыдавецтва, выдаючы кніжку „Бальшавіцкім тэмпам", мела на ўвазе прысьці на дапамогу комсамольскай ячэйцы. Але, выдаючы ўсякую кнігу БДВ павінна ведаць, што мала таго, каб зварачваць увагу на вокладку і загаловак. Трэба раз і на заўсёды прывучыць БДВ заглядваць і ў зьмест кнігі. Кніга „Бальшавіцкім тэмпам", некаторымі сваімі заблытанымі формуліроўкамі дэзорыентуе комсамольскую організацыю ў вырашэньні складанейшых політычных задач вясновай сяўбы

Асноўны недахоп гэтай брошуркі заключаецца ў тым, што ўпрашчэнства асобных політычных формуліровак даходзіць проста кажучы да опортуністычных поглядаў. Так, на старонцы 16 аўтар піша: **„актыўнасьці кулацтва партыя супроцьстаўляе згуртаванасьць батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас. мобілізуе іх супроць кулака і вядзе весьці далейшыя рашучыя наступленьні на кулацка-капіталістычныя элемэнты".** Гэта ў той час, калі партыя высунула, як галоўны лёзунг, ліквідацыю кулацтва, як клясы, калі лёзунг абмежаваньня кулацкіх элемэнтаў з асноўнага ператварыўся ў падсобны. Аўтар, не закранаючы пытаньня аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, даводзіць сваю думку да вышэйсказанага. Перад комсамольскай організацыяй зараз стаіць задача практычнага выкананьня лёзунгу партыі па ліквідацыі кулацтва, як клясы. „Комсамольскія ячэйкі вёскі павінны вытрымаць свой політычны экзамен на ўдзел у ліквідацыі клясы кулацтва. Правядзеньне масавай колектывізацыі непарыўна зьвязана з задачай ліквідацыі кулака, як клясы. Гэта задача зьяўляецца неадлучнай часткай усяго працэсу суцэльнага абагуленьня сельскай гаспадаркі" („Комсамольская Правда"). Установка зусім зразумелая, яна павінна была быць асабліва адзначана ў гэтай брошуры, але-ж аўтар працягвае заблытвацца па формуліроўках і надалей. На гэтай-жа старонцы прыводзіцца цытата з прамовы тав. Сталіна на зьезьдзе аграрнікаў марксыстых, у якой ён гаварыў, што: „Зараз мы маем мажлівасьць павесьці рашучае наступленьне на кулацтва, зламаць яго супраціўленьне, ліквідаваць яго, як клясу, і замяніць яго вытворчасьць вытворчасьцю колгасаў і савгасаў". І тут-жа пасьля гэтай цытаты аўтар робіць заключэньне, што „выходзячы з гэтага катэгорычна забаронены прыём кулакоў ва ўсе віды колектыўных аб'яднаньняў і праводзіцца ачыстка колгасаў ад кулацкіх ды нэпманаўскіх элемэнтаў". На гэтым аўтар паставіў кропку і больш аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, нічога не сказаў. Дзе-ж тут лёгіка паміж заключэньнем аўтара і прыведзенай цытатай тав. Сталіна? Характэрна, што гэта не выпадковая рэч, бо на працягу ўсёй кніжкі не разглядваюцца ўсе пытаньні пад кутом погляду суцэльнай колектывізацыі, работы сярод беднаты і батрацтва і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Такі вузкі дзяляцкі вывад з складанейшага політычнага лёзунгу партыі ня толькі не дапаможа комсамольскай ячэйцы ў рабоце, а, наадварот, можа прытупіць яе ўвагу і дэзорыентаваць яе ў рабоце па ліквідацыі кулацтва, як клясы. Тав. Сталін па гэтаму пытаньню зусім ясна пісаў: „Каб выцясьніць кулацтва, як клясу, для гэтага недастаткова політыка абмежаваньня і выцясьненьня асобных яго атрадаў. Каб выцесьніць кулацтва, як клясу, патрэбна зламаць у адкрытым баі супраціўленьні гэтай клясы і пазбавіць яе вытворчых крыніц яе існаваньня і разьвіцьця (вольнае карыстаньне зямлёю, сродкамі вытворчасьці, арэнда, права найму працы і г. д.). гэта і ёсьць паварот да політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Бяз гэтага разважаньні аб выцясьненьні кулацтва, як клясы—ёсьць пустая балбатня, угодная і выгадная толькі правым ухілістым. Бяз гэтага нямысьліма ніякая сур'ёзная, а тым больш суцэльная колектывізацыя вёскі. Гэта добра зразумелі беднякі і серадняки нашай вёскі, якія громяць кулацтва і ажыцьцяўляюць суцэльную колектывізацыю. Гэтага яшчэ, як відаць не разумеюць некаторыя нашы таварышы". Вось гэтым момантам патрэбна было-б кіравацца для таго, каб ня ўводзіць у заблуканьне комсамольскія ячэйкі.

Далей у кніжцы паданы прыклады плян работы ячэйкі, у якім пішацца: „прыкладам таго, як трэба падыходзіць да складаньня пляну, мы падаем плян Абчугацкай ячэйкі комсамолу". Зьмест гэтага пляну мы лічым неабходным падаць тэкстуальна. У ім гаворыцца: „1. Правесьці сход сялян у 10 вёсках па пытаньню ўздыму ўраджайнасьці, 2. У вёсках Кіявец і Абчуга організаваць дзьве дружыны для дапамогі беднаце ў час вясеньняй засеўнай кампаніі, 3. Стварыць групы з 10 чал. для работы пры зернаачышчальным абозе, які ёсьць у сельсавеце. 4. Організаваць групу з 5 чал. для распаўсюджваньня сельска-гаспадарчай літаратуры. 5. У тых гаспадарках, дзе ёсьць комсамольцы, правесьці раньняе ворыва папару, правесьці іншыя агрыкультурныя мерапрыемствы, якія будзе раіць агроном. 6. Кожны комсамолец павінен зьбіраць попел для засеву яго на сваіх палёх, частка попелу павінна ісьці для ленінскай дзесяціны (зьвярні ўвагу: на сваіх палёх, а не на колектыўных **П. С. і А. Д.**). 7. У вёсцы Кіявец сіламі ячэйкі організаваць колгас. У вёсцы Абчуга організаваць машыннае таварыства, дапамагаць парт'ячэйцы організоўваць вызначаныя тры колгасы і 4 таварыствы. 8. Кожнаму комсамольцу пасеяць ня менш 10 фунтаў канюшыны. 9 Комсамольскім гаспадаркам (індывідуальным, а не колектыўчым. **Заўвага наша**) пасеяць ня менш аднаго фунту кармовых буракоў і г. д.".

Бачыце, куды гне гэты плян! Калі ў мінулым годзе, як ЦК УсеЛКСМ і адзначыў асноўным недахопам у рабоце комсамолу Беларусі было тое, што паход за ўраджай і колектывізацыю замест масавага руху комсамолу за разьвіцьцё колгасаў, фактычна ператварыўся ў рух па ўздыму індывідуальных гаспадарак, у брошуры працягваецца гэтая памылка. Замест таго, каб гэты плян падвергнуць шырокай крытыцы, паказаць, як ячэйка д з я л я ц к і падышла да складаньня пляну па выкананьню асноўных задач партыі, аўтар лічыць гэты плян „больш-менш лепшым"

Праўда, у кніжцы зроблена да гэтага пляну агаворка, што „мы ў гэтым годзе ставім перад сабою значна большыя і больш адказныя задачы галоўным чынам па лініі колектывізацыі", але гэта агульная агаворка зусім не папраўляе прыведзенага „прыкладнага" пляну, які раіцца ячэйцы.

Замест таго, каб шырока ў пляне адзначыць суцэльную колектывізацыю, работу сярод беднаты і батрацтва, выкананьне лёзунгу партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, аб клясавай барацьбе і г. д., гэты плян падаецца выхалашчаным ад політычных пытаньняў. Такія выхалашчаныя рацэпты, як плян Абчуцкай ячэйкі комсамолу, які раіцца „як больш-менш лепшы", пры пасьлядоўным ажыцьцяўленьні яго ячэйкай можа завесьці яе ў опортуністычнае балота, ён прытупляе клясавую баяздольнасьць комсамольскай ячэйкі і дэзорыентуе яе ў выкананьні асноўных політычных задач вясеньняй пасеўкампаніі. Ня будзем адбіраць часу ў чытача на аналізы цэлага шэрагу агранамічных парад для комсамольскіх ячэек, у якіх ня выпечана роля савгасаў і колгасаў, спынімся на парадах пра мэтады соцыялістычнага спаборніцтва. У кніжцы раюцца якія асноўныя пытаньні павінны быць уключаны ў дагавор па соцспаборніцтву. „Рабочыя, якія выклікаюць на соцспаборніцтва колгасьнікаў, могуць узяць на сябе абавязак **у тэрмін, а магчыма і раней** адрамантаваць у с е сельска - гаспадарчыя прылады, якія ёсьць у майстэрнях, адносіцца сумленна да работы, вызначаць і выконваць конкрэтныя заданьні па дапамозе правядзеньня сельска-гаспадарчай кампаніі. Разам з тым можна прапанаваць сялянам колгасьнікам на ўсе 100 проц. выканаць плян засеўнай кампаніі і г. д."

Мы пытаем, што гэта за лібэральная пастаноўка пытаньняў. Усім вядома, што партыя ставіць пытаньне аб неабходнасьці поўнага выкананьня нашых плянавых меркаваньняў, кіто мы зараз паставілі задачу выканаць пяцігодку ў 4 гады і мэтад соцыялістычнага спаборніцтва зьяўляецца галоўнейшым у выкананьні ўсіх нашых плянавых меркаваньняў. Мы пытаемся—каму патрэбна такая мяккацелая пастаноўка пытаньня?

Для нас зусім незразумела, чаму в працягу ўсёй кніжкі з поля дзейнасьці комсамольскай ячэйкі выпаў батрак і ня толькі ўпушчана работа сярод батрацкай моладзі, але ў кніжцы зусім выпала работа сярод беднаты і батрацтва наогул і ў прыватнасьці работа комсамольскіх ячэек сярод батрацкай і бядняцкай моладзі. Тав. Молатаў у сваім дакладзе гаварыў: „Даказваць яшчэ цяпер, што організацыя беднаты ў вёсцы зьяўляецца пярвейшым абавязкам кожнага комуністага, а таксама і кожнага комсамольца, проста няхоўка. Які-ж гэта комуністы, альбо комсамолец, калі ён здолеп забываць аб асноўнай задачы комуністага ў вёсцы, аб згуртаваньні бядняцка-батрацкага ядра ў саветах пад кіраўніцтвам партыі". Гэтая цытата не патрабуе аніякіх для яе тлумачэньняў, бо нямысьліма выкананьне ўсіх задач, якія стаяць перад намі бяз шырокай організацыі батрацка-бядняцкіх мас у саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

Між іншым у разьдзеле аб масавай рабоце аўтар ніводным словам не заікнуўся аб рабоце сярод батрацкай і бядняцкай моладзі, абмежаваўшыся толькі паказаньнем на шэраг дробных даўно вядомых форм работы ячэйкі ЛКСМБ.

Ня спыняючыся на цэлым шэрагу дробных недахопаў кнігі, мы прыходзім да вываду, што кніга не дае яскравай і правільнай установкі комсамольскай ячэйкі ў організацыі батрацка-бядняцкіх мас у саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам партыі на выкананьне асноўных політычных задач вясновай пасеўнай кампаніі, па суцэльнай колективізацыі, па ліквідацыі кулацтва, як клясы, а значыць дэзорыентуе комсамольскую ячэйку ў выкананьні гэтых політычных задач. Выходзячы з гэтага, кніжка ня можа быць пакладзена ў аснову работы комсамольскіх ячэек у час вясновай сельска-гаспадарчай кампаніі.

П. Садоўскі.
А. Джалюк.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

У „Чырвоную Зьмену" быў прыслан допіс пад назвай: „Абараніць батрачку". Па допісу даручана ўпаўнаважанаму па працы Заслаўскага раёну ўтварыць расьсьледваньне; упаўнаважаны паведамляе, што наймальнік Вярбіла Ясько прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці па 223 арт. і 132 арт. Крымінальнага Кодэксу. Адначасова прыцягваецца сябра сельсавету Сакалоўскі, які добра ведаў аб пабоях і эксплёатацыі батрачкі, але захоўваў гэта.

—

У „Чырвонай Зьмене" ад 19-12—29 г. зьмешчан допіс пад назвай: „Прынялі па протэкцыі" у якім пісалася, што ў час набору ў ФЗВ 1-ай друкарні некаторыя вучні былі прыняты па пратэкцыі. Бюро скаргаў НК РСІ і МенРСІ паведамляюць, што заметка падцьвердзілася і даручана Акр. інспэктару Працы вырашыць пытаньне аб зьняцьці з працы няправільна прынятых вучняў

—

На допіс, зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене", аб чужых элемэнтах у навучальных установах пад назвай „Клясавы вораг у ВНУ", Наркомасьветы паведамляе: што Еўгін—студэнт Рагачоўскіх Пэдкурсаў, на падставе прысланага матар'ялу Сьвержаньскай комсамольскай і партыйнай ячэйкамі аб тым, што матка яго ўвесь час займалася гандлем і пазбаўлена выбарчых правоў,—выключан з курсаў.

Нікалаевіч Паўлюк, студэнт БДУ, таксама выключан. Адносна вучня профтэхшколы хэмікаў Аёлы, паведаміла, што на яго маюцца рэабілітуючыя дакумэнты, на падставе якіх ён і быў прыняты ў школу.

—

У „Чырвоную Зьмену" быў прыслан допіс пад назвай: „Можаце гнаць самагонку", па допісу вытварана сьледзтва. Нарсьледчы 8-га вучастку Мен. акр. паведамляе, што настаўнік Кардзюкоўскай школы Сасыловіч Сымон прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці за сувязь з кулацтвам і папом. Справа па абвінавачаньню яго па 196 і 212 арт. Крымінальнага Кодэксу накіравана ў суд для разгляду.

—

У „Чырвонай Зьмене № 7 ад 9-І-30 г. быў зьмешчан допіс пад назвай: „Загрузьлі ў брудзе", дзе пісалася аб анты-санітарным становішчы ў Міхалкаўскім аддзяленьні Мозырскага спажывецкага таварыства „Смычка". Праўленьне паведамляе, што факты ў асноўным падцьвердзіліся і прыняты меры для іх зьнішчэньня.

—

На прысланы ў рэдакцыю допіс аб тым, што комсамольцы Славінскай ячэйкі Папкоў, Пляшкоў і Шайдараў падпісаліся на заяве сына папа аб аднаўленьні яго ў выбарчых правох, Капыльскі РК ЛКСМБ (Аршаншчына) паведамляе, што факты адпавядаюць сапраўднасьці і з боку Славінскай ячэйкі, а таксама і РК сэкратару ячэйкі Пляшкову вынесена суровая вымова з папярэджаньнем, а сябрам ЛКСМБ Папкову і Шайдараву вынесены вымовы.

Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ пастанавіў організаваць пры музэі Рэволюцыі аддзел рэволюцыйнага руху моладзі і дзіцячага комруху ў БССР.

Для падрыхтоўкі і організацыі гэтага аддзелу вылучан савет з 9 асоб пад старшынствам т. **Ратнэра.**

Курсанты ня маюць прытулку

У Воршы адчынены 8-мімесячныя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ. На курсы залічана 23 чалавекі з колгасаў і савгасаў, а таксама з прадпрыемстваў. Пасьля залічэньня, Аршанскі інспэктарыят асьветы паведамляе курсантаў прыяжджаючых к 5-І, захапіць з сабою пасьцельныя прылады. Прыехала 12 курсантаў, заняткі пачаліся. Курсантам недзе прытуліцца, няма інтэрнату, сталовай, а стыпэндыя (14 рублёў у месяц) пакуль што ў проэкце. У горадзе ня знойдзеш кватэры, а калі хто і знаходзіць, дык не па кішэні.

Бачачы, што з 12 засталося 8 чал., загадчык курсаў стварае другую камісію і каб папоўніць склад, залічваюць 27 новых асоб. Калі запытаешся загадчыка курсаў т. Яфімава аб часе выдачы грошай,—ён кажа:—„10 чал. на сваё ўтрыманьне возьме Акрколгассаюз і профэсыянальныя організацыі". Зусім адваротнае адказвае Акрколгассаюз:—„Няма сродкаў, каб дзяржаць на сваім утрыманьні 10 чалавек". Пачаўся вялікі адсеў.

О. А-й М.

АК РК і ячэйкам ЛКСМБ

Рэдакцыя газэты ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена" ў пачатку сакавіка месяца г. г. наладжвае шырокую

РАДЫЕ-КОНФЭРЭНЦЫЮ ЧЫТАЧОЎ ГАЗЭТЫ

Надаючы гэтаму мерапрыемству вялікае значэньне, як сродку сувязі газэты з шырокімі масамі комсамолу і ўсёй працоўнай моладзі, ЦК ЛКСМБ прапануе АК РК і ячэйкам прыняць актыўны ўдзел у наладжваньні шырокіх сходаў комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі ў тых месцох, дзе ёсьць радыё-установкі і гучна-гаварыцелі (клюбы, хаты-чытальні і г. д) у дзень радыё-канфэрэнцыі

Аб тэрміну радыё-канфэрэнцыі будзе паведамлена асоба праз газэту.

За сэкратара ЦК ЛКСМБ **Рындзіч.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ФРК ЛКСМБ СКЛІКАЕ КУСТАВЫЯ СХОДЫ КОМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК, НА ЯКІХ БУДУЦЬ ЗАСЛУХАНЫ СПРАВАЗДАЧЫ АБ ПРАЦЫ РК ЛКСМБ.

ДОМ АСЬВЕТЫ (Комуністычная вул.). У суботу 15 лютага, а 6-й гадз. увечары павінны зьявіцца наступныя ячэйкі: Белдзяржбуд, будаўнікі (саюзная), тэкстыльная фабрыка, Гандальбудтрэст, галянтарэйная фабрыка, аўтатранспарт, нархарч, абкамтрэст, курсы комву. у. валаканал, музтэхнікум, Белпайгандаль, Белдзяржкіно, Белдзяржтэатр, мэталістых, ДЭТ, шорная фабрыка, профшкола хэмікаў, дашкольны тэхнікум, двухгадовыя пэдкурсы, Белжылсаюз, НДІ, савгаскія: імя Будзёнага, імя Розы Люксэмбург, імя Лекерта, ЦНА (вясковая) і Лошыца (вясковая).

КЛЮБ ХАРЧАВІКОЎ (Школьная вул.). У суботу 15 лютага а 6-й гадз. увечары павінны зьявіцца наступныя ячэйкі: хлебазавод, аддзяленьне хлебазаводу, двух харчзаводаў, цукерная фабрыка, групком харчавікоў, цагельні № 1 і 2, дрэваапрацовачнікаў (саюзная), п-к. абутнікаў, п-к. швэйнікаў, профтэхшкола швэйнікаў, профтэхшкола будаўнікоў, польпэдтэхнікум, саюзхлеб, акрфа, міліцыя, нарсувязь, харчтрэст, Наркамгандаль, працасьветы, мэдсанпрацы, комгас.

КЛЮБ ДРУКАРОЎ (Ленінская вул.) У нядзелю, 16 лютага, а 6-й гадзіне ўвечары павінны зьявіцца наступныя ячэйкі: друкарні БДВ, друкароў (саюзная), завод „Комунар", фабрыка „Акцябр", завод ДО, Эльвод, шпалерная фабрыка, скарняжная фабрыка ЦСУ, Дзяржгандаль, агульна - адукацыйныя курсы.

КЛЮБ НАРСУВЯЗІ (Ленінская вуліца). У нядзелю 16 лютага, а 6-й гадзіне ўвечары павінны зьявіцца ўсе комсамольцы, якія працавалі 15 лютага на другой зьмене і якія па іншых уважлівых прычынах не маглі быць 15 лютага на куставым сходзе.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел № 599